КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
_______________ А.І.Жук
«___» _______________ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД 31-1-85/2024 /вуч.

# ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫ АНАЛІЗ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці**
**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура**

2024 г.

Сканировано с CamScanner

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021, (20.04.2022, №85), вучэбных планаў спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура (15.07.2021, №048 – 2021/у; 23.06.2022, №133 – 2022/у)

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

І.М.Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
М.С.Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

С.М.Тычына, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук;
А.І.Жышкевіч, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар
ДУА «Гімназія № 43 г. Мінска» М.Ф.Кавалеўская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 от 25.03.2024 г.)

Загадчык кафедры ____________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 7 ад 07.05 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела БДПУ ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

Сканировано с CamScanner

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура.

Вучэбная дысцыпліна «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» носіць практыка-арыентаваны і кампетэнтнасны характар, садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў навыкаў прафесійнага аналізу мастацкага тэксту.

***Мэты вучэбнай дысцыпліны*** – палепшыць літаратуразнаўчую падрыхтоўку будучых настаўнікаў, паглыбіўшы веды пра мастацкі твор як факт мовы і мастацтва, падрыхтаваўшы да прафесійнага прачытання мастацкага тэксту.

***Задачы вучэбнай дысцыпліны*:**

– даць студэнтам рознабаковыя веды па вучэбнай дысцыпліне;

– пазнаёміць студэнтаў-філолагаў з сучаснымі навуковымі школамі, якія прапануюць розныя падыходы да аналізу мастацкага тэксту, з метадалогіяй і методыкай літаратуразнаўчага аналізу;

– даць узоры літаратуразнаўчага тлумачэння мастацкіх твораў, паказаць магчымасці і межы прымянення розных метадаў і прыёмаў аналізу мастацкага тэксту;

– фарміраваць уменні і навыкі прафесійнага літаратуразнаўчага аналізу твораў мастацкай літаратуры;

– сфарміраваць здольнасць разумець мастацкі тэкст як з’яву мастацтва слова;

– сфарміраваць уменні і навыкі свабодна і самастойна аналізаваць мастацкі твор, падрыхтаваць будучых настаўнікаў да аналізу мастацкіх твораў у школе;

– развіваць культуру даследчай дзейнасці студэнтаў, накіраваную на самастойны літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту;

– садзейнічаць фарміраванню канцэптуальнасці мыслення, узбагачэнню інструментальнага дыяпазону, развіццю творчых здольнасцей студэнтаў.

***Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.*** Згодна з вучэбным планам па спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура вучэбная дысцыпліна «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі. Вучэбная дысцыпліна «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» звязана з вучэбнымі дысцыплінамі «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Літаратурная крытыка», «Тэорыя літаратуры», якія ўваходзяць у кампанент установы вышэйшай адукацыі.

***Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыялізаванай кампетэнцыі СК-12: Прымяняць асноўныя метады і прыёмы аналізу літаратурнага тэксту з мэтай цэласнага ўяўлення аб яго моўнай, культуралагічнай і гістарычнай сутнасці.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць***:

– асноўныя метадалагічныя прынцыпы, метады і прыёмы літаратуразнаўчага аналізу;

– асаблівасці кампазіцыі лірычных, эпічных і драматычных тэкстаў;

– структурна-семантычную арганізацыю мастацкага тэксту, сюжэтна-кампазіцыйныя і жанравыя асаблівасці твораў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***умець***:

– прымяняць прынцыпы, метады і прыёмы літаратуразнаўчага аналізу да канкрэтнага мастацкага тэксту;

– праводзіць літаратуразнаўчае каменціраванне мастацкага тэксту;

– аналізаваць мастацкі твор, выкарыстоўваючы асноўныя тэарэтыка-літаратурныя паняцці;

– выдзяляць у мастацкім тэксце сістэму мастацкіх сродкаў, накіраваную на вырашэнне тых ці іншых ідэйна-мастацкіх задач;

– арыентавацца ў спецыяльнай літаратуры па вучэбнай дысцыпліне.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***валодаць:***

– адпаведным паняційным і тэрміналагічным апаратам;

– навыкамі аналізу розных аспектаў мастацкага твора;

– асноўнымі метадамі і прыёмамі літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

***Асноўнымі тэхналогіямі навучання з'яўляюцца***: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія. Рэкамендаваныя метады і прыёмы навучання: тлумачэнне, эмпірычная гутарка, аналіз літаратурна-крытычных тэкстаў, аналіз мастацкіх твораў, супастаўленне мастацкага твора і літаратурна-крытычнага водгуку на яго і інш.

***Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.*** Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках пад кантролем выкладчыка, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна (самастойная работа студэнтаў), канспектаванне першакрыніц, напісанне

рэфератаў і творчых работ, складанне прэзентацый, правядзенне літаратуразнаўчага аналізу мастацкіх тэкстаў розных родаў і жанраў і інш.

***Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, форма прамежкавай атэстацыі.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» на 4 курсе ў 7 семестры разлічана на 96 вучэбных гадзін. З іх 42 аўдыторныя гадзіны: 20 лекцыйных, 22 гадзіны практычных заняткаў. Форма атрымання адукацыі – дзённая, форма прамежкавай атэстацыі – залік.

Размеркаванне гадзін па семестрах:

| Семестр | Усяго | Лекцыі | Практычныя | Самастойная работа студэнтаў | Форма прамежкавай атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|
| VII | 96 | 20 | 22 | 54 | Залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту

Прадмет, мэты і задачы літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту. Месца літаратуразнаўчага аналізу тэксту ў сістэме літаратуразнаўчых дысцыплін. Разнавіднасці літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту. Канцэптуальны аналіз.

## Тэма 2. Мастацкі тэкст як аб'ект вывучэння

Спецыфіка мастацкага тэксту. Паняцце аб тэксце як шматузроўневай сістэме. Розныя падыходы да вызначэння структуры мастацкага тэксту.

Адзінкі мастацкага тэксту, іх экспрэсіўнасць. Размежаванне паняццяў экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць.

## Тэма 3. Метадалогія літаратуразнаўчага аналізу

Падыходы да літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту. Аспекты літаратуразнаўчага аналізу. Прынцыпы, якія вызначаюць выбар канкрэтных прыёмаў і метадаў аналізу мастацкага тэксту. Метады літаратуразнаўчага аналізу.

Літаратуразнаўчае каменціраванне як метадычны прыём.

## Тэма 4. Адметнасць літаратуразнаўчага аналізу твораў розных родаў літаратуры

Літаратуразнаўчы аналіз лірычных твораў. Вобраз-перажыванне і спосабы яго раскрыцця, сістэма вобразных сродкаў у вершы. Роля паўтораў. Вобраз лірычнага героя. Тэматычная і жанравая разнастайнасць лірыкі. Першы радок і тэма тэксту. Алгарытм цэласнага літаратуразнаўчага аналізу лірычнага твора. Аналіз кампазіцыі верша. Аналіз інтанацыйнага малюнка тэксту. Рытмічная арганізацыя тэксту.

Асаблівасці літаратуразнаўчага аналізу эпічнага твора. Эпічны твор і яго асноўныя жанры. Апавядальная структура эпічнага твора. Спосабы стварэння вобразаў дзеючых асоб у мастацкім творы. Вобраз аўтара. Спосабы выражэння аўтарскай пазіцыі ў тэксце. Алгарытм цэласнага літаратуразнаўчага аналізу эпічнага твора. Тыпы апавядальнікаў. Дэталь як сродак мастацкай індывідуалізацыі, яе роля ў стварэнні выявы.

Асаблівасці літаратуразнаўчага аналізу драматычнага твора. Драматычны твор, яго асаблівасці. Выкарыстанне тэатразнаўчых канцэпцый і рэжысёрскіх прыёмаў у працэсе аналізу і інтэрпрэтацыі драмы. Прыёмы раскрыцця характараў у драматычным творы, роля рэмарак, рэплік, спісу дзеючых асоб. Канфлікт у драме і спосабы яго выражэння. Алгарытм цэласнага літаратуразнаўчага аналізу драматычнага твора. Дэкарацыі. Спіс дзеючых асоб. Галоўныя і другарадныя персанажы. Аналіз афішы. Аналіз рэплік персанажаў.

## Тэма 5. Структура і будова мастацкага тэксту

Літаратурны твор як мастацкае цэлае. Змест і форма літаратурнага твора.

Будова літаратурнага твора. Дваістасць кампазіцыі: знешняя (фармальная) і ўнутраная (змястоўная). Знешняя кампазіцыя. Унутраная, ці змястоўная, кампазіцыя.

Прынцыпы і спосабы сувязі элементаў у тэксце. Вонкавыя і ўнутраныя сувязі тэксту. Характар узаемаадносін паміж часткамі і цэлым. Кантраст і паралелізм у арганізацыі тэксту. Вылучэнне найважнейшых апазіцый. Кампазіцыйна-моўнае адзінства. Разнавіднасці паўтору і яго функцыі.

## Тэма 6. Літаратуразнаўчы аналіз у дзейнасці настаўніка-філолага

Выкарыстанне літаратуразнаўчага аналізу ў практыцы выкладання літаратуры. Роля літаратуразнаўчага аналізу ў падрыхтоўцы настаўніка-славесніка. Значэнне літаратуразнаўчага каменціравання для тлумачальнага чытання ў школе. Распрацоўка фрагмента ўрока з элементамі літаратуразнаўчага аналізу канкрэтнага мастацкага тэксту (або яго ўрыўка).

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**«ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫ АНАЛІЗ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ»**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫ АНАЛІЗ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ** | **20** | **22** | **54** | | | |
| **1.** | **Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту** | **2** | **2** | **9** | | | |
| ***1.1.*** | ***Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту*** | ***2*** | | | | | |
| | 1. Прадмет, мэты і задачы літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту.<br>2. Месца літаратуразнаўчага аналізу тэксту ў сістэме літаратуразнаўчых дысцыплін. | | | | Схема «Віды аналізу мастацкага тэксту». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4] | |
| ***1.2.*** | ***Спецыфіка літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту*** | | ***2*** | ***9*** | | | |
| | 1. Разнавіднасці літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту.<br>2. Канцэптуальны аналіз. | | | | Прэзентацыя «Разнавіднасці літаратуразнаўчага аналізу». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4] | Праверка канспекта. |
| **2.** | **Мастацкі тэкст як аб’ект вывучэння** | **2** | **2** | **9** | | | |
| ***2.1.*** | ***Мастацкі тэкст як аб’ект даследавання*** | ***2*** | | | | | |
| | 1. Спецыфіка мастацкага тэксту.<br>2. Паняцце аб тэксце як шматузроўневай сістэме.<br>3. Узроўневая арганізацыя мастацкага тэксту.<br>4. Эстэтычная матываванасць формы мастацкага твора экстралінгвістычнымі фактарамі. | | | | Схема «Экспрэсіўнасць ≠ эмацыянальнасць». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[6] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ***2.2.*** | ***Асаблівасці аналізу мастацкага тэксту*** | | ***2*** | ***9*** | | | |
| | 1. Адзінкі мастацкага тэксту, іх экспрэсіўнасць.<br>2. Размежаванне паняццяў экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць. | | | | Тэксты для аналізу. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[6]<br>[8] | Вуснае апытанне, аналіз тэксту. |
| **3.** | **Метадалогія літаратуразнаўчага аналізу** | **2** | **2** | **9** | | | |
| ***3.1.*** | ***Метадалогія літаратуразнаўчага аналізу*** | ***2*** | | | | | |
| | 1. Агульны падыход да літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту.<br>2. Аспекты літаратуразнаўчага аналізу.<br>3. Прынцыпы і метады, якія вызначаюць выбар канкрэтных прыёмаў і метадаў аналізу мастацкага тэксту. | | | | Схема «Метады літаратуразнаўчага аналізу». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[5] | |
| ***3.2.*** | ***Метады і прыёмы літаратуразнаўчага аналізу*** | | ***2*** | ***9*** | | | |
| | 1. Асноўныя метады літаратуразнаўчага аналізу.<br>2. Літаратуразнаўчае каменціраванне як метадычны прыём.<br>3. Роля вертыкальнага кантэксту ў разуменні мастацкага твора. | | | | Схема «Кантэкст». | [1]<br>[2]<br>[3] | Калёквіум. |
| **4.** | **Адметнасць літаратуразнаўчага аналізу розных родаў літаратуры** | **8** | **8** | **9** | | | |
| ***4.1.*** | ***Адметнасць літаратуразнаўчага аналізу розных родаў літаратуры*** | ***8*** | | | | | |
| | 1. Спецыфіка літаратуразнаўчага аналізу мастацкіх тэкстаў розных жанраў.<br>2. Літаратуразнаўчы аналіз лірычнага тэксту.<br>3. Асаблівасці літаратуразнаўчага аналізу эпічнага мастацкага тэксту.<br>4. Спецыфіка літаратуразнаўчага аналізу драматычнага тэксту. | | | | Прэзентацыя «Аналіз мастацкіх твораў». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[9]<br>[10] | |
| ***4.2.*** | ***Спецыфіка аналізу лірычных, эпічных і драматычных твораў*** | | ***8*** | ***9*** | | | |
| | 1. Падрабязнае вывучэнне мастацкіх тэкстаў розных жанраў з выкарыстаннем літаратуразнаўчага аналізу.<br>2. Алгарытм цэласнага літаратуразнаўчага аналізу лірычнага твора.<br>3. Алгарытм цэласнага літаратуразнаўчага аналізу эпічнага твора.<br>4. Алгарытм цэласнага аналізу драматычнага твора. | | | | Схема «Алгарытм аналізу мастацкіх твораў», тэксты для аналізу. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[9]<br>[10] | Пісьмовы аналіз тэксту, узаемная праверка студэнтамі работ адзін аднаго. |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **5.** | **Структура і будова мастацкага тэксту** | **4** | **4** | **9** | | | |
| ***5.1.*** | ***Структура і будова мастацкага тэксту*** | ***4*** | | | | | |
| | 1. Літаратурны твор як мастацкае цэлае.<br>2. Будова літаратурнага твора.<br>3. Прынцыпы і спосабы сувязі элементаў у тэксце.<br>4. Разнавіднасці паўтору і яго функцыі. | | | | Схема «Структура і будова мастацкага тэксту». | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[8] | |
| ***5.2.*** | ***Аналіз мастацкага твора ў адзінстве зместу і формы*** | | ***4*** | ***9*** | | | |
| | 1. Змест і форма літаратурнага твора.<br>2. Знешняя і ўнутраная кампазіцыя.<br>3. Вонкавыя і ўнутраныя сувязі тэксту.<br>4. Аналіз мастацкага твора ў адзінстве зместу і формы. | | | | Тэксты для аналізу. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[8] | Даклады і паведамленні па тэме «Змест і форма літаратурнага твора». |
| **6.** | **Літаратуразнаўчы аналіз у дзейнасці настаўнікаў-філолагаў** | **2** | **4** | **9** | | | |
| ***6.1.*** | ***Літаратуразнаўчы аналіз у дзейнасці настаўнікаў-філолагаў*** | ***2*** | | | | | |
| | 1. Выкарыстанне літаратуразнаўчага аналізу ў практыцы выкладання літаратуры.<br>2. Роля літаратуразнаўчага аналізу ў падрыхтоўцы настаўніка-славесніка. | | | | Урокі настаўнікаў-філолагаў. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[9] | |
| ***6.2.*** | ***Вывучэнне мастацкага твора на ўроку літаратуры*** | | ***4*** | ***9*** | | | |
| | 1. Значэнне літаратуразнаўчага каменціравання для тлумачальнага чытання ў школе.<br>2. Распрацоўка фрагмента ўрока з элементамі літаратуразнаўчага аналізу канкрэтнага мастацкага тэксту (або яго ўрыўка).<br>3. Асаблівасці вывучэння лірычных твораў на ўроках літаратуры.<br>4. Асаблівасці вывучэння эпічных твораў на ўроках літаратуры.<br>5. Асаблівасці вывучэння драматычных твораў на ўроках літаратуры. | | | | Планы-канспекты ўрокаў. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[9]<br>[10] | Распрацоўка фрагмента ўрока. |
| | **Усяго ў VII семестры** | **20** | **22** | **54** | | | **Залік** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Тэорыя літаратуры [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей: 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)» / склад.: І. М. Гоўзіч, А. І. Луоўскі // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/132. – Дата доступу: 19.04.2024.

2. Филологический анализ текста [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс / сост.: Г. А. Камлевич, А. Л. Церковский // СДО Moodle / Белорус. гос. пед. ун-т. – Режим доступа: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=5233. – Дата доступа: 19.04.2024.

3. Филологический анализ текста [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс для специальностей 1-02 03 02 Русский язык и литература, 1-02 03 04 Русский язык и литература. Иностранный язык / сост.: Г. А. Камлевич, А. Л. Церковский // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: https://elib.bspu.by/handle/doc/37125. – Дата доступа: 19.04.2024.

**Дадатковая літаратура**

4. Есин, А. Б. Принципы и приемы анализа литературного произведения : учеб. пособие для студентов и преподавателей филол. фак., учителей-словесников / А. Б. Есин. – 10-е изд. – М. : Флинта : Наука, 2010. – 244 с.

5. Луговский, А. И. Изучение теории литературы по «Евгению Онегину» / А. И. Луговский // Рус. яз. и лит. – 2011. – № 4. – С. 13–16.

6. Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса : давед. маладога літаратара / В. П. Рагойша. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 158 с.

7. Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 576 с.

8. Рагойша, В. П. Уводзіны ў літаратуразнаўства : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ па філал. спецыяльнасцях : у 2 ч. / В. П. Рагойша, М. П. Кенька, Т. А. Марозава. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2011. – 2 ч.

9. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / В. Рагойша. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2001. – 384 с.

10. Турышева, О. Н. Теория и методология зарубежного литературоведения : учеб. пособие для студентов вузов / О. Н. Турышева. – М. : Наука : Флинта, 2012. – 160 с.

11. Хомякова, О. Р. Теория литературы : учеб. пособие для студентов учреждений высш. пед. образования по филол. специальностям / О. Р. Хомякова. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2013. – 359 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» арганізуецца кафедрамі, выкладчыкамі ўстаноў вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з Палажэннем аб самастойнай рабоце студэнтаў.

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае выкананне тэставых задання, падрыхтоўку прэзентацый, рэфератаў, дакладаў па вызначанай тэматыцы, канспектаванне і рэферыраванне навуковай літаратуры, напісанне артыкулаў для выступлення на студэнцкіх навуковых канферэнцыях.

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1.2. | Спецыфіка літаратуразнаўчага аналізу. | 9 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падрыхтаваць матэрыял для вывучэння твораў на ўроках літаратуры | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка канспектаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 2.2. | Асаблівасці аналізу мастацкага тэксту. | 9 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падрыхтаваць рэферат (праект) на тэму «Аналіз як метад навуковага даследавання» (па выбары студэнта). | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка рэфератаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 3.2. | Метады і прыёмы літаратуразнаўчага аналізу. | 9 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падрыхтаваць даклад «Метадалогія аналізу мастацкага тэксту». | Калёквіум, праверка прэзентацый, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 4.2. | Спецыфіка аналізу лірычных, эпічных і драматычных твораў. | 9 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падрыхтаваць адказы на пытанні:<br>1. Спосабы выражэння аўтарскай пазіцыі ў тэксце. Аб’ектыўнае і суб’ектыўнае.<br>2. Выкарыстанне рэжысёрскіх рэмарак пры вывучэнні драматычных твораў.<br>3. Інсцэніраванне і мізансцэніраванне | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка прэзентацый, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | на ўроку літаратуры. | |
| 5.2. | Аналіз мастацкага твора ў адзінстве зместу і формы. | 9 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял. Падрыхтавацца да дыскусіі «Што найбольш важнае ў творы: змест ці форма?». | Вусная праверка атрыманых ведаў, праверка прэзентацый тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 6.2. | Вывучэнне мастацкага твора на ўроку літаратуры. | 9 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял. Распрацаваць план-канспект урока па вывучэнні лірычнага, эпічнага і драматычнага твораў. | Вусная праверка атрыманых ведаў, правядзенне ўрокаў, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| | **УСЯГО** | **54** | | |

# ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТАЎ

Для бягучага кантролю і самакантролю па вучэбнай дысцыпліне «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» прапануюцца:

– вуснае апытанне (франтальнае і індывідуальнае);
– індывідуальная або франтальная гутарка;
– вусная ці пісьмовая ўзаемаправерка студэнтамі ведаў адзін аднаго;
– праверка выкананых практычных заданняў (аналіз тэксту, характарыстыка дэталяў, супастаўленне тэкстаў і г.д.);
– праверка наяўнасці канспекта лекцыйнага матэрыялу і вучэбнай літаратуры, правядзення пісьмовага агляду навуковай літаратуры, тэматычнай падборкі літаратурных і інтэрнэт-крыніц;
– візуальная праверка выкананых даследчых і творчых заданняў;
– ацэнка ўзроўню абароны падрыхтаваных паведамленняў, тэматычных дакладаў, рэфератаў, прэзентацый, эсэ;
– даследаванне ўзроўню і вызначэнне якасці аналітычнай апрацоўкі тэксту (анатаванне, рэферыраванне, рэцэнзаванне, складанне рэзюмэ) праз вусныя ці пісьмовыя выступленні студэнтаў;
– пытанні і заданні да заліку.

Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – залік.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Прадмет, мэты і задачы літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту.
2. Месца літаратуразнаўчага аналізу тэксту ў сістэме літаратуразнаўчых дысцыплін.
3. Патрабаванні да літаратуразнаўчага аналізу мстацкага тэксту: міждысцыплінапрны аспект.
4. Адзінкі мастацкага тэксту, іх экспрэсіўнасць. Размежаванне паняццяў экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць.
5. Асноўныя прынцыпы літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту.
6. Метады літаратуразнаўчага аналізу мастацкага тэксту.
7. Літаратуразнаўчае каменціраванне.
8. Спецыфіка літаратуразнаўчага аналізу лірычнага тэксту.
9. Асаблівасці літаратуразнаўчага аналізу эпічнага тэксту.
10. Адметнасць літаратуразнаўчага аналізу драматычнага тэксту.
11. Літаратурны твор як мастацкае цэлае, змест і форма літаратурнага твора.
12. Будова і структура літаратурнага твора.
13. Знешняя кампазіцыя і яе структурныя элементы.
14. Унутраная кампазіцыя і яе структурныя элементы.
15. Выкарыстанне літаратуразнаўчага аналізу ў пры вывучэнні твораў у школе.
16. Роля літаратуразнаўчага аналізу ў падрыхтоўцы настаўніка-славесніка.
17. Метады аналізу мастацкага тэксту ў школе
18. Прыёмы аналізу мастацкага тэксту ў школе.
19. Шляхі аналізу мастацкага твора ў школе.
20. Тыпы/віды аналізу мастацкага тэксту ў школе.

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***10 (дзесяць) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне вольна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;

творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***9 (дзевяць) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

сістэматычная, актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***8 (восем) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***7 (сем) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

вольнае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***6 (шэсць) балаў, залічана:***

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***5 (пяць) балаў, залічана:***

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў.

***4 (чатыры) балы, залічана:***

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў.

***3 (тры) балы, не залічана:***

недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

***2 (два) балы, не залічана:***

фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

***1 (адзін) бал, не залічана:***

адсутнасць ведаў (і кампетэнцый) у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, адсутнасць на атэстацыі без уважлівай прычыны.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

па вывучаемай дысцыпліне
з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці

| Назва вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з дысцыплінай рабочай праграмы | Кафедра, якая забяспечвае вывучэнне гэтай дысцыпліны | Прапановы кафедры аб зменах у змесце рабочай праграмы | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Тэорыя літаратуры» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы 5 «Структура і будова мастацкага тэксту» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Тэорыі літаратуры» | 25.03.2024 Пратакол № 8 |
| «Уводзіны ў літаратуразнаўства» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы 3 «Метадалогія літаратуразнаўчага аналізу » абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Уводзінах у літаратуразнаўства» | 25.03.2024 Пратакол № 8 |
| «Літаратурная крытыка» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы 1 «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Літаратурнай крытыцы» | 25.03.2024 Пратакол № 8 |